■ ЛІТАРАТУРНЫЯ АКЦЭНТЫ



**Яўген ПЕТРАШЭВІЧ нарадзіўся ў вёсцы Падбараны Мастоўскага раёна Гродзенскай вобласці. Настаўнік музыкі, кампазітар. Закончыў Мінскае му3 зычнае вучылішча. У недалёкім мінулым – кіраўнік фальклор3 нага ўзорнага ансамбля «Гарадзенскія дударыкі» (1990–2002). Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь, узнагарод3 жаны шматлікімі ганаровымі граматамі. Выдаў кнігу вершаў «Пасынкі» (2012) і некалькі зборнікаў лірычных песень. Жыве ў Гродна.**

*Я прыйду*

*Я прыйду да цябе,*
*як твой сябра-равеснік,*
*я прыйду да цябе*
*мілагучнаю песняй.*
*Я прыйду да цябе,*
*як прыходзіць світанак,*
*я прыйду да цябе,*
*як прыходзіць каханы.*
*Я прыйду да цябе,*
*як узнімецца сонца,*
*зазірну, бы прамэнь,*
*у каханай ваконца.*
*Нечакана прыйду,*
*як няўрымслівы вецер,*
*і заспею, знайду*
*ясным днём,*
*ці то ўвечар…*
*Я прыйду да цябе,*
*прыгажэйшая з кветак,*
*я прыйду да цябе,*
*нібы верш да паэта.*

## МІХАСЮ ВАСІЛЬКУ

*Як пакліча здалёк голас чысты,*
*дзявочы,*
*і пачуеш ты песню з блакітных*
*вышынь.*
*І твае васількова-нябесныя вочы –*
*дарагі напамін Васільковай душы.*
*Паўстагоддзе, як спіш,*
*але край твой не дрэмле.*
*Ледзве чутна ліецца*
*знаёмы матыў:*
*як любіў ты зямлю сваю*
*родную вельмі,*
*як твае вершы, песні народ*
*не забыў.*
*Ці навек памірае паэт,*
*мне скажыце?*
*О, як нам не хапае свайго земляка!*
*Кожны год васілёчкі*
*квітнеюць у жыце –*
*напамінак душы Міхася Васілька.*

## ДЗЕНЬ ПАМЯЦІ

*Не кружы над імі вараннё,*
*спяць тут вечным*
*сном сыны-героі.*
*Выпаў ім, на жаль,*
*трагічны лёс,*
*але з рук не выпусцілі зброі.*
*За геройства,*
*мужнасць вам хвала*
*ад жывых нашчадкаў,*
*ад Краіны.*
*Вы стаялі ў бітве,*
*як скала,*
*подзьвіг ваш у бездань*
*час не зрынуў.*
*Сёння і дарослы, і юнак*
*адчувае волі дух свабодны.*
*Дык прыміце кветкі*
*нашы ў знак*
*запаветнай памяці*
*народнай.*

## ФРАНЦІШКУ БАГУШЭВІЧУ

*Быў роднаму краю аддадзены*
*(пра гэта мы ведаем з кніжак),*
*народжаны ў вёсцы Жупраны*
*паэт Багушэвіч Францішак.*
*Ён быў не святы і не грэшны,*
*стаяў за народ занядбаны,*
*і вершы падпісваў пацешна:*
*«Мацей Бурачок*
*з-пад Ашмянаў».*
*Мы помнім крылатыя словы,*
*што й сёння гучаць*
*вельмі свежа:*
*«Шануйце, браты, нашу мову –*
*душы беларускай адзежу!».*
*Шчыруем, жывём без прымусу*
*і падзім па-людску са светам,*
*а «Дудку» і «Смык беларускі»*
*шануем, як імя паэта.*